# «ПРАБЛЕМЫ, ЯКІЯ ЎЗНІКАЮЦЬ, ТРЭБА ВЫРАШАЦЬ КОМПЛЕКСНА І ПАСЛЯДОЎНА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Генеральнай пракуратурай у 2024 годзе ўзбуджаны шэраг крымінальных спраў у адносінах да першага намесніка старшыні Брэсцкага аблвыканкама Валянціна Зайчука. «Першы намеснік хвалёнага старшыні аблвыканкама! Хто будзе за вашымі намеснікамі сачыць?» — абурана звярнуўся Прэзідэнт да губернатараў. Зайчук атрымаў грашовае ўзнагароджанне ў выглядзе хабару на суму тысячы долараў за паспяховае вырашэнне пытанняў, якія ўваходзяць у яго кампетэнцыі. «Ідзе следства паўгода. За хабар», — пацвердзіў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый Шулейка.

Крымінальная справа ўзбуджана ў адносінах да былога намесніка міністра энергетыкі Міхаіла Міхадзюка. «Чалавек усё жыццё адпрацаваў у міністэрстве. На пенсію пайшоў... За спрыяльнае вырашэнне пытанняў па выбары (кампанія RIKO славенская) вышэйназванай кампаніі ў якасці падрадчыка пры правядзенні работ па будаўніцтве, рэканструкцыі, мадэрнізацыі высакавольтных падстанцый на тэрыторыі Беларусі. Гэта значыць — на табе падстанцыю, ідзі мадэрнізуй, але ты мне дай хабар. Дзясяткі тысяч долараў», — расказаў падрабязнасці Прэзідэнт.

У пачатку лютага Генпракуратура ўзбудзіла крымінальную справу ў дачыненні да Паўла Важніка, былога кіраўніка мінскага прадпрыемства «Гараўтамост». А да гэтага ён працаваў на адказнай пасадзе ў структуры Гаррамаўтадара Мінскага гарвыканкама. «З ліпеня 2023 года набраў хабараў на дзясяткі тысяч долараў», — расказаў кіраўнік дзяржавы.

Яшчэ адзін факт датычыцца першага намесніка кіраўніка спраў Прэзідэнта Дзмітрыя Рыбко. «Хабарнік, кляйма ставіць няма дзе. Сядзіць», — сказаў Прэзідэнт. Ён нагадаў і пра крымінальную справу супраць свайго былога памочніка па Віцебскай вобласці Ігара Брыло, па гэтай справе на сёння прыцягнуты тры дзясяткі чалавек. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што гэта толькі некаторыя выпадкі, якія кожны дзень яму прадстаўляюць.

«У мяне закон адзін даўным-даўно: факты на стол. І вось, праваахоўныя органы прыносяць гэтыя факты. Кожны ранак у мяне на стале пэўны стос дакументаў аб усіх махлярствах. Я ж вам намякаў: не лезьце, не бярыце чужога, гэта не ваша. Тайнай у Беларусі гэта не будзе. Мне атрымалася прывіць адпаведную вакцыну нашаму народу, які ўвогуле не церпіць карупцыі і крадзяжу», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Больш я вас угаворваць і прасіць не буду. Крок налева, крок направа — да сценкі паставім. Публічна вам заяўляю. Як пытанні нейкія вырашыць — ну проста бяда: сам вызначаеш пытанні, сам ставіш заданні і сам едзеш правяраеш і потым робіш замест вас. Апошняя размова з вамі. Якая б электаральная кампанія ні была. Я вам ужо неяк казаў: я тут асабліва не паруся наконт таго, падтрымаеце вы мяне ці не. Я дамоўлюся з беларускім народам. Я знайду з ім агульную мову. Я тры дзясяткі гадоў знаходжу з ім агульную мову. А вось вы падумайце, з кім вы будзеце працаваць», — цвёрда папярэдзіў беларускі лідар.

Вяртаючыся да парадку дня нарады, Аляксандр Лукашэнка акрэсліў тры асноўныя пытанні, якія патрабуюць абмеркавання.

## ПЕРШАЕ — ЭФЕКТЫЎНАЯ РАБОТА ПЕЛЕТНЫХ ВЫТВОРЧАСЦЯЎ

«Пабудавалі дзясятак прадпрыемстваў, а можа, і больш па вытворчасці пелет. Гэта было маё жорсткае настойлівае патрабаванне. Чаму? Ляціш над краінай: буралому, усякай гадасці ў лесе — страшна глядзець. Думаю, а чаму гэта не перапрацаваць і не атрымаць ад гэтага эфект. Пабудавалі заводы, якія ўсё пераўтвараюць у шчапу, і мы атрымліваем выдатны паліўны рэсурс», — нагадаў кіраўнік дзяржавы. Але, па яго словах, дзякуючы яго дамоўленасцям на самым высокім узроўні, сёння ёсць магчымасць выкарыстоўваць газ. «Дровы не патрэбныя, пелеты не патрэбныя. На экспарт пастаўляць не можам, лагістыка не дазваляе ці розуму не хапае. І ўнутры краіны не спажываем», — абурыўся Аляксандр Лукашэнка. Ён пацікавіўся, як працуюць сёння прадпрыемствы па вытворчасці пелет. «Створаны значныя магутнасці па вытворчасці пелет, што дало магчымасць уключыць у вытворчасць нізкасортную драўніну і адходы дрэваапрацоўкі, — адзначыў беларускі лідар. — Мы можам выпрацоўваць — удумайцеся толькі — амаль мільён тон пелет у год. Немалыя інвестыцыі ўклалі. Як дзяржаўныя, так і прыватныя. Але сёння ў сілу вядомых знешніх абставін пелетныя вытворчасці працуюць ні хістка ні валка. Растуць запасы нізкасортнай дзелавой драўніны. Гэта значыць, у лесе гніе рэсурс. Пры гэтым меры, якія прымаюцца ўрадам, шчыра кажучы, выніку пакуль не далі».

Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт: калі вытворчасці створаны, то яны павінны працаваць. І, само сабой, не ва ўрон. «А праблемы, якія ўзнікаюць, трэба вырашаць комплексна і паслядоўна, — сказаў ён. — На нарадзе па прамысловасці мы дамовіліся, што ўсе пытанні па дзейнасці пелетных вытворчасцяў будуць вырашаны да пачатку ацяпляльнага сезона. Сёння прыйшоў час зверыць гадзіннік, як дадзеныя планы па маім даручэнні выконваюцца».

Прэзідэнт пацікавіўся, якія перспектывы дзейнасці пелетных вытворчасцяў, што зроблена для пошуку новых рынкаў збыту і схем паставак, што з павелічэннем ужывання гэтай прадукцыі на ўнутраным рынку, якія рашэнні прыняты па стымуляванні выкарыстання пелет насельніцтвам і ў энергетычнай сістэме краіны.

Намеснік прэм'ер-міністра Пётр Пархомчык далажыў пра развіццё пелетнай вытворчасці. Па яго словах, у краіне створана 64 пелетныя прадпрыемствы сумарнай магутнасцю каля мільёна тон у год. 60 працэнтаў падкантрольныя Мінлясгасу і «Беллеспаперпраму», 40 працэнтаў — бязведамаснай падпарадкаванасці. Пётр Пархомчык адзначыў, што будаўніцтва гэтых прадпрыемстваў было выклікана неабходнасцю перапрацоўкі адыходаў лесапілавання і экспартнай прыцягальнасцю пелет на рынку Еўрапейскага саюза. У 2021 годзе было пастаўлена ў Еўропу 570 тысяч тон пелет. «А чаму толькі ў Еўропу? Вы клалі яйкі ў адзін кошык. Я і цяпер вас папярэджваю, што гэтага рабіць нельга», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Сёння прадпрыемствы па вытворчасці пелет у асноўным спынены і закансерваваны. «Вы закансервавалі нармальныя прадпрыемствы, якія могуць выпрацоўваць мільён тон патрэбных для краіны прадуктаў», — абурыўся Прэзідэнт. Як растлумачыў Пётр Пархомчык, гэта зроблена таму, што сёння ўнутраны рынак не гатовы спажываць такую колькасць пелет. Адпаведную работу плануецца правесці на працягу двух гадоў.

## ДРУГОЕ ПЫТАННЕ — ДЗЕЙНАСЦЬ АГРАСЭРВІСАЎ

Сёння гэта 134 арганізацыі, якія аказваюць аграсэрвісныя — транспартныя, рамонтныя і іншыя — паслугі аграрыям. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, як развіваліся такія арганізацыі. З прыходам рынкавай эканомікі прапаноўвалася іх ліквідаваць. Але гэтую ідэю не падтрымалі. Прэзідэнт перакананы, што аграсэрвісы павінны працаваць і сёння. Больш за тое, гэта павінны быць сэрвісныя цэнтры нашых буйных прадпрыемстваў. МАЗ, МТЗ і іншыя сёння ствараюць свае сэрвісныя цэнтры ў іншых краінах. І гэта правільна, бо, як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, без сэрвісу, без паслуг ніхто не будзе купляць тэхніку. «А чаму мы не можам у сваёй краіне не ствараць гэтыя сэрвісныя цэнтры, а карыстацца імі? — задаў рытарычнае пытанне беларускі лідар. — «Гомсельмаш» пастаўляе камбайны? Пастаўляе. «Бабруйскаграмаш» і іншыя пастаўляюць тэхніку для вёскі? Пастаўляюць. Так 134 арганізацыі яны павінны аднавіць, каб яны аказвалі паслугі на месцы, каб бандыты і жулікі-пасрэднікі не прывозілі нейкія запчасткі».

Аналагічная сітуацыя, паводле слоў Прэзідэнта, і з перасоўнымі механізаванымі калонамі, якія былі шырока распаўсюджаны ў савецкія часы і патэнцыял якіх трэба захаваць і развіваць, асабліва на ўзроўні раёнаў. «Аднавіце іх. У нас 200 тысяч га трэба аднаўляць па меліярацыі. Хто будзе гэта рабіць? Гэтыя МПМК (міжраённыя перасовачныя механізаваныя калоны)», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка. Акрамя выканання цэлага комплексу работ: ад дробнай дапамогі насельніцтву па рамонце сельгасінвентару да больш глабальных задач па меліярацыі — развіццё ПМК дае таксама і дадатковыя рабочыя месцы, магчымасць працаўладкавання ў вёсцы.

«Тым, хто забыўся, нагадаю: у 2019 годзе мы ўжо аказалі беспрэцэдэнтную падтрымку галаўному прадпрыемству «Белаграсэрвіса», — нагадаў Прэзідэнт. — То-бок вы працуеце абы-як, у даўгах як у шаўках «Белаграсэрвіс», рэструктурызавалі, адтэрмінавалі даўгі, даравалі фактычна. Вы чаго зноў да мяне прыйшлі?»

Жалезнае патрабаванне ад Прэзідэнта губернатарам і ўраду — павінна быць жорсткая дысцыпліна разлікаў — і кропка. «Пры гэтым папярэджваю вас: перад сялянамі, калгасамі, саўгасамі не павінна быць на 1 жніўня ніякай запазычанасці ні па малаку, ні па мясе. У жулікаў забірайце грошы, якія раскралі, і аддайце сялянам грошы за пастаўленую прадукцыю», — заявіў Прэзідэнт.

## ТРЭЦЯЕ, ВЕЛЬМІ ВАЖНАЕ, ПЫТАННЕ — СІСТЭМА СПАДАРОЖНІКАВАЙ СУВЯЗІ І ВЯШЧАННЯ

Спадарожнік сувязі запушчаны ў 2016 годзе і пасля вываду на арбіту і ўводу ў эксплуатацыю наземнага комплексу паспяхова выконвае свае функцыі. Асноўная задача сёння — яго камерцыялізацыя і акупнасць.

«Спадарожнік запусцілі не толькі для таго, каб у сваіх інтарэсах выкарыстоўваць. Але нават калі ў сваіх — за спадарожнік трэба плаціць, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — У 2020 годзе мной было падпісана распараджэнне, якім вызначаны парадак выканання фінансавых абавязацельстваў па праекце «Стварэнне нацыянальнай сістэмы спадарожнікавай сувязі і вяшчання Рэспублікі Беларусь». Сёння ўрад прапануе яго скарэкціраваць». Але, як заявіў Аляксандр Лукашэнка, ніякіх карэкціровак, звязаных з грашыма, не будзе.

**Валерыя СЦЯЦКО.**



Фота БЕЛТА.

### ❍ У тэму

Пасля нарады яе ўдзельнікі расказалі журналістам, як будуць вырашацца акрэсленыя Прэзідэнтам пытанні і выконвацца яго даручэнні.

**Старшыня ваенна-прамысловага камітэта Дзмітрый ПУНТУС** адзначыў, што нацыянальныя сістэма спадарожнікавай сувязі і вяшчання на сёння працуе ва ўстаноўленым парадку, усе тэхнічныя аспекты ў норме. «На сённяшні момант мы аказваем паслугі сувязі ўсім сілавым ведамствам і не толькі. Працуем з Мінінфармам па распаўсюджванні каналаў агульнадаступнага вяшчання. Работа будзе працягнута з мэтай павышэння камерцыялізацыі нашых нацыянальных сістэм», — адзначыў Дзмітрый Пунтус.

**Віцэ-прэм'ер Пётр ПАРХОМЧЫК** падкрэсліў, што сёння вядзецца актыўная работа над тым, каб пашырыць выкарыстанне пелет на ўнутраным рынку. «Урадам выпрацаваны комплексныя планы па выкарыстанні пелет на ўнутраным рынку, і мы працягваем працаваць з пошукам альтэрнатыўных варыянтаў пастаўкі гэтай прадукцыі ў іншыя краіны», — расказаў Пётр Пархомчык. Ужо ажыццёўлена першая пастаўка пелет ва Узбекістан. Плануецца, што гэта краіна стане пастаянным спажыўцом дадзенай прадукцыі.

«Вельмі цікавы для нас рынак Кітайскай Народнай Рэспублікі. Хоць лагістыка вельмі складаная. Вялікая колькасць машынакамплектаў з Кітая ідуць на нашы прадпрыемствы, якія выпрацоўваюць легкавыя аўтамабілі, а вяртаюцца яны пустымі. Калі выбудаваць гэта дакладна, то можна атрымаць выгадную лагістыку для прадпрыемстваў, якія выпрацоўваюць аўтамабілі, і для пастаўкі пелет у Кітай. Але тут ёсць адзін маленькі нюанс. У Кітаі яны свае адходы выкарыстоўваюць, а нам пастаўку дадзенай прадукцыі забаранілі. Мы цяпер адпрацоўваем гэтае пытанне», — расказаў намеснік прэм'ер-міністра. Ён таксама адзначыў, што даручэнне Прэзідэнта па актывізацыі спажывання пелет на ўнутраным рынку будзе выканана. Пелеты могуць выкарыстоўвацца ў энергетыцы, ЖКГ і іншых сферах. Пётр Пархомчык прывёў цікавыя лічбы: дроў у краіне за год выкарыстоўваецца 860 тысяч тон. А, калі замяніць дровы на пелеты, будзе выкарыстоўвацца 430 тысяч тон. Але для гэтага трэба правесці вялікую работу па замене абсталявання, прывыкнуць да новага віду паліва. Адпаведная работа ўжо праводзіцца. Таму, перакананы Пётр Пархомчык, нельга ставіць крыж на пелетнай вытворчасці.

**Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Сяргей БАРТАШ** расказаў, што сістэма аграсэрвісаў будзе захавана. «Абмяркоўвалася пытанне — даць магчымасць закупіць з адной крыніцы запасныя часткі, якія пастаўляюцца сістэмай «Белаграсэрвісу», для таго, каб сельгаспрадпрыемствам не трэба было праводзіць працэдуру закупкі, конкурсныя таргі і яны маглі спакойна прыехаць і атрымаць іх у структурах «Белаграсэрвісу» — таксама, як і на заводах-вытворцах», — сказаў ён. Што датычыцца фінансавага становішча «Белаграсэрвісу», міністр растлумачыў, што з-за непагашэння запазычанасцяў прадпрыемствамі і арганізацыямі асобных абласцей, якім раней, у перыяд з 2006 года, пастаўлялася тэхніка, узнікла пратэрмінаваная запазычанасць. Быў указ, які дапамог рэструктурызаваць запазычанасць і даць адтэрміноўку, але не ва ўсіх абласцях спрацавалі. «Сёння, атрымліваецца, Гродзенская і Брэсцкая вобласці забяспечылі пагашэнне запазычанасцяў практычна поўнасцю, а ёсць вобласці, якія не забяспечылі пагашэнне. Адпаведна, Прэзідэнтам дадзена даручэнне дапрацаваць прапановы і ўсё ж паставіць усіх у роўныя ўмовы — і тыя, хто пагасіў, таксама павінны атрымаць нейкую фінансавую падтрымку», — адзначыў Сяргей Барташ.

Падрабязнасці

# «Карэйка» нашых дзён

## Супрацоўнікі ГУБАЗіК расказалі падрабязнасці агучанай на нарадзе ў Прэзідэнта справы аб хабарніцтве на Беларускай чыгунцы

**Як паведамілі ў Галоўным упраўленні па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй Міністэрства ўнутраных спраў, у выніку комплексу аператыўна-вышуковай дзейнасці выкрыта карупцыйная схема, якую стварыў і курыраваў адзін з кіраўнікоў Беларускай чыгункі. ГУБАЗіК выявіла факты сістэмнага хабарніцтва топ-менеджара, які лабіраваў інтарэсы камерцыйных структур, занятых у сферы грузаперавозак.**

Так, зафіксавана атрыманне хабару ад прадстаўнікоў адной з буйных беларускіх камерцыйных кампаній, якая займаецца грузаперавозкамі як па тэрыторыі Беларусі, так і па краінах блізкага і далёкага замежжа. Супрацоўнікамі Галоўнага ўпраўлення ўстаноўлена, што фігурант крымінальнай справы толькі ў выніку некалькіх апошніх перад затрыманнем сустрэч з прадстаўнікамі камерцыйных структур атрымаў хабару на агульную суму больш за $300 000. А падчас следчых дзеянняў у тайніках кватэры і загараднага дома хабарніка знойдзены і канфіскаваны грашовыя сродкі на агульную суму больш за тры мільёны долараў ЗША. Гэта, дарэчы, самая вялікая сума хабараў за ўсю гісторыю незалежнай Беларусі. Маштабы сапраўды ўражваюць, асабліва на фоне не вельмі добрага фінансавага становішча чыгункі.

Каментуючы гучную справу, афіцэры ГУБАЗіК адзначылі, што фігуранта можна назваць «прафесійным хабарнікам», мэта ўсяго жыцця якога — незаконнае ўзбагачэнне. Яны правялі нават паралель між ім і «грамадзянінам Карэйкам» з агульнавядомага твора Ільфа і Пятрова. І на самай справе між імі шмат агульнага. Так, высокапастаўлены чыгуначнік, як і кніжны мільянер, вёў вельмі сціплы, ледзь не аскетычны, лад жыцця. Нават яго родныя і блізкія не здагадваліся аб тым, колькі грошай схавана за фальшсцяной у ванным пакоі. За ім не заўважана ніякіх буйных набыткаў, у адпачынак сям'я ездзіла раз у пяць-сем гадоў. У ГУБАЗіК таксама адзначылі і тое, што злачынца даволі ўмела ўтойваў працэс непасрэднай перадачы хабараў, выкарыстоўваючы ўсе магчымыя і вядомыя метады маскіроўкі і канспірацыі. Але ж да пары сіцечка сее...



На сёння ГУБАЗіК сумесна са Следчым камітэтам праводзяць мерапрыемствы па ўстанаўленні ўсіх фактаў злачыннай дзейнасці сучаснага «Карэйкі».

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**
**Фота прадастаўлена прэс-службай МУС.**


Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

**Извещение о проведении электронных торгов в форме электронного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390 |
| **Продавец** | Частное предприятие «Скреппи-Инвест», Минский р-н, Колодищанский с/с, а. г. Колодищи, ул. Тюленина, д. 18/1, пом. 6, УНП 692206955 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5, УНП 191224638 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронного аукциона**

**Административное помещение 564 кв. м.**
(инв. № 500/D-7077018, составные части и принадлежности: технич. помещения в подвальном этаже 17 м², 10,3 м², 16,6 м², 17,2 м², 10 м², 16,2 м², 10,5 м², 15,1 м², 418,7 м², два балкона)
Адрес: **г. Минск, ул. Мельникайте, 2-3** (8-й этаж)

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 394 800,00 долларов США**

*Примечание: цена продажи лота фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона

**Обременения по лоту:** площади помещений частично сданы в аренду. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

**Задаток** 120 000,00 бел. руб. перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (г. Минск) БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** оплата должна быть произведена в течение **14 (четырнадцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы». Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить **вознаграждение организатору торгов 1 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 18.07.2024 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 17.07.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**



ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ООО «Коллекция света» (УНП 191540367, г. Минск, ул. Тимирязева, д. 97, каб. 3).

***Дата и время проведения торгов*: 17 июля 2024 года**. Начало – 10.00. Заявки принимаются с 15 июня 2024 года по 15 июля 2024 года.

***Место проведения торгов:*** Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «Коллекция света» (УНП 191540367)** в лице ликвидатора – директора ООО «Юридическое агентство «Клевер-Консалт» Колыско А. А., тел. 8 (029) 399-20-40.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 1 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайте https://specrealization.by/. Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.



**Информация о проведении аукциона по продаже земельного участка в частную собственность для ведения личного подсобного хозяйства**

| Номер лота. Местонахождение земельного участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена, руб. |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 г. п. Свирь | 0,07 | 624087490501000027 | Для ведения личного подсобного хозяйства | 7000 |
| Дата, время и место проведения аукциона | 16 июля 2024 г. в 15.00, г. п. Свирь, ул. А. Гуриновича, д. 29-1 (зал заседаний) Свирский сельский исполнительный комитет | | | |
| Извещение опубликовано | Официальный сайт Минского облисполкома www.minsk-region.gov.by (http://minsk-region.gov.by/ekonomika-i-finansy/zemelnye-uchastki-01/zemelnye-uchastki-v-chastnuyu-sobstvennost-01/). Официальный сайт Государственного комитета по имуществу gki.gov.by (https://au.nca.by/search). Официальный сайт Мядельского райисполкома http://myadel.gov.by/guest/myadel-delovoy/zemelnye-uchastki | | | |

УНП 600097436



**ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении открытого аукциона**

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» **22 июля 2024 года в 11.00** проводит открытый аукцион по продаже имущества

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи без НДС, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот 1 | Бульдозер SHANTUI SD-32, заводской номер SD32AA102965, год выпуска 2010, регистрационный знак 9682 ТА-6, инвентарный номер 2961 | 30 000,00 | 3000,00 |
| Лот 2 | Экскаватор гусеничный JCB JS220SC, заводской номер JCBJS220CA61203762, год выпуска 2006, регистрационный знак ТК-6 3057, инвентарный номер 654 | 102 000,00 | 10 200,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 802220712424.
2. Дата, время и место проведения аукциона: **22 июля 2024 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).
4. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000, код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607
5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **16.07.2024 г., время: 17.00**.
6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.
8. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.
9. Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещено в газете «Звязда», на сайте ОАО «ДСТ № 3».



**ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного открытого аукциона**

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3»
**02 июля 2024 года в 11.00** проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи со снижением 20 %, без НДС, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот 1 | Автомобиль легковой специальный «Шкода Октавия», хэтчбек, цвет – бежевый металлик, 2008 год выпуска, кузов (рама) № TMBBE41Z982217917, регистрационный знак 8500 ВЕ-6, инвентарный номер 70364 | 12 160,00 | 1216,00 |
| Лот 2 | Автомобиль легковой Skoda Octavia, хэтчбек, цвет – бежевый металлик, 2008 год выпуска, кузов (рама) № TMBCA41Z292015485, регистрационный знак 9047 IВ-6, инвентарный номер 652 | 6720,00 | 672,00 |
| Лот 3 | Автомобиль легковой PEUGEOT 3008, универсал (UNIVERSAL), цвет – черный, 2015 год выпуска, кузов (рама) № Y3W0U5FS0FF000051, регистрационный знак 3913 IА-6, инвентарный номер 648 | 13 760,00 | 1376,00 |
| Лот 4 | Автомобиль легковой специальный, VOLKSWAGEN PASSAT, седан, цвет – серебристый металлик, 2006 год выпуска, кузов (рама) № WVWZZZ3CZ7P075125, регистрационный знак 0597 ЕI-6, инвентарный номер 70316 | 11 920,00 | 1192,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 802220712424.
2. Дата, время и место проведения аукциона: **02 июля 2024 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).
4. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000, код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607
5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **26.06.2024 г., время: 17.00**.
6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.
8. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.
9. Извещение о проведении предыдущего аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещено в газете «Звязда» 13.03.2024, на сайте ОАО «ДСТ № 3».